АРГАНІЧНЫ ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ УПАЎНАВАЖАНЫМ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Праект для грамадскага абмеркавання

16.04.2025

# ЗМЕСТ

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ 3

ГЛАВА 2. ПАРАДАК АБРАННЯ, СПЫНЕННЯ ПАЎНАМОТВАЎ, ВЫЗВАЛЕННЯ АД ПАСАДЫ 3

ГЛАВА 3. ПРАВАВЫЯ ГАРАНТЫІ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ПАЎНАМОЦТВАЎ УПАЎНАВАЖАНАГА 6

ГЛАВА 4. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ УПАЎНАВАЖАНАГА 8

ГЛАВА 5. НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРЭВЕНТЫЎНЫ МЕХАНІЗМ ПА ПАПЯРЭДЖАННІ КАТАВАННЯЎ 14

ГЛАВА 6. ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ СКАРГАЎ 15

ГЛАВА 7. АБАРОНА І ПРАСОЎВАННЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА 19

ГЛАВА 8. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ УПАЎНАВАЖАНАГА І ЯГО ОФІСА 21

ГЛАВА 9. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ 23

Праект[1] 16.04.2025

# АРГАНІЧНЫ ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
# АБ УПАЎНАВАЖАНЫМ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Гэты Арганічны Закон вызначае статус Упаўнаважанага па правах чалавека (далей – Упаўнаважаны), парадак прызначэння на пасаду і адхілення ад пасады, яго кампетэнцыі, прынцыпы і гарантыі яго дзейнасці.

## ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Прававыя асновы дзейнасці Упаўнаважанага

1. У сваёй дзейнасці Упаўнаважаны кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь.

2. У аснове дзейнасці Упаўнаважанага ляжаць прынцыпы законнасці, бесстароннасці, галоснасці, павагі правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, а таксама прынцып «не нашкодзь», які прадугледжвае выключэнне рызыкі прычынення шкоды заяўнікам, ахвярам парушэнняў і іншым асобам, што ўзаемадзейнічаюць з Упаўнаважаным.

### Артыкул 2. Прававы статус Упаўнаважанага па правах чалавека

1. Упаўнаважаны па правах чалавека з'яўляецца незалежнай службовай асобай, якая дзейнічае ў мэтах заахвочвання і абароны правоў і свабод чалавека.

2. Дзейнасць Упаўнаважанага дапаўняе існыя сродкі абароны правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, не адмяняе іх і не прыводзіць да перагляду кампетэнцыі дзяржаўных органаў, якія забяспечваюць абарону і аднаўленне парушаных правоў і свабод.

## ГЛАВА 2. ПАРАДАК АБРАННЯ, СПЫНЕННЯ ПАЎНАМОТВАЎ, ВЫЗВАЛЕННЯ АД ПАСАДЫ

### Артыкул 3. Патрабаванні да кандыдата на пасаду Упаўнаважанага

Упаўнаважаным па правах чалавека можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які:

мае вышэйшую адукацыю;

характарызуецца прызнанай рэпутацыяй абаронца правоў чалавека і высокімі маральнымі якасцямі;

мае не менш за сем гадоў досведу ў сферы абароны правоў і свабод чалавека, уключаючы праваабарончую, навуковую, адукацыйную, судовую, пракурорскую, адвакатскую, журналісцкую, дыпламатычную, міжнародную, праваапрымяняльную або іншую дзейнасць, накіраваную на абарону і прасоўванне правоў чалавека.

[1] Праект арганічнага Закона «Аб Упаўнаважаным па правах чалавека» распрацаваны ў адпаведнасці з праектам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Грамадскай канстытуцыйнай камісіяй https://kanstytucyja.online/index.php/text/by

**Артыкул 4. Абранне Упаўнаважанага**

1. Упаўнаважаны абіраецца на пасаду Соймам тэрмінам на сем гадоў па выніках адкрытага конкурсу без права пераабрання і працягвае займаць пасаду да моманту абрання і ўступлення ў пасаду свайго пераемніка.

2. Конкурсная камісія фарміруецца пастаяннай камісіяй Сойма, у кампетэнцыю якой уваходзяць пытанні правоў чалавека. У склад конкурснай камісіі, акрамя дэпутатаў, абавязкова ўключаюцца прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, а таксама навуковай супольнасці, якія валодаюць досведам у сферы правоў чалавека.

3. Парадак арганізацыі і правядзення конкурсу, а таксама патрабаванні да сяброў конкурснай камісіі вызначаюцца Палажэннем аб конкурсе на пасаду Упаўнаважанага, якое зацвярджаецца Пастановай Сойма. Палажэнне павінна прадугледжваць працэдуры, што забяспечваюць адкрытасць, інклюзіўнасць і празрыстасць конкурснага працэсу.

4. Этапы конкурсу на пасаду Упаўнаважанага ўключаюць:

4.1. публікацыю аб'явы аб правядзенні конкурсу на афіцыйных інтэрнэт-рэсурсах Сойма і Офіса Упаўнаважанага па правах чалавека (далей — Офіс), а таксама іншыя спосабы інфармавання не пазней чым за тры месяцы да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў дзеючага Упаўнаважанага або на працягу аднаго месяца пасля з’яўлення вакансіі пасады Упаўнаважанага;

4.2. прыём заявак ад кандыдатаў на ўдзел у конкурсе на працягу 45 дзён з дня апублікавання аб'явы;

4.3. разгляд конкурснай камісіяй пададзеных заявак і адбор не больш як трох кандыдатаў, якія адпавядаюць патрабаванням да Упаўнаважанага па правах чалавека Рэспублікі Беларусь. Прадстаўленне спісу адабраных кандыдатаў у рэйтынгавым парадку на разгляд Сойма павінна быць ажыццёўлена на працягу 30 дзён з дня заканчэння прыёму заявак.

5. Рашэнне аб абранні Упаўнаважанага прымаецца Соймам большасцю галасоў дэпутатаў ад канстытуцыйнага складу Сойма тайным галасаваннем і афармляецца Пастановай Сойма.

6. У выпадку, калі ні адзін з кандыдатаў не набраў неабходнай колькасці галасоў для прызначэння на пасаду Упаўнаважанага, конкурсная камісія на працягу аднаго месяца праводзіць паўторны адбор і высоўванне новых кандыдатур на пасаду Упаўнаважанага.

7. На ўсіх этапах конкурснага адбору, вылучэння і абрання Упаўнаважанага павінны забяспечвацца максімальная празрыстасць і даступнасць інфармацыі.

**Артыкул 5. Прывядзенне Упаўнаважанага да прысягі**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека прыступае да выканання сваіх абавязкаў пасля прывядзення да прысягі.

2. Тэкст прысягі Упаўнаважанага: «Я, (імя і прозвішча), уступаючы на пасаду Упаўнаважанага па правах чалавека, урачыста прысягаю абараняць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, кіруючыся Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі нормамі і стандартамі, а таксама прынцыпамі справядлівасці і гуманізму. Абавязуюся добрасумленна выконваць ускладзеныя на мяне абавязкі, дзейнічаць з поўнай незалежнасцю і бесстароннасцю ў інтарэсах чалавека.»

3. Прысяга прыносіцца ва ўрачыстай абстаноўцы на пленарным пасяджэнні Сойма.

4. Акт аб прынясенні прысягі падпісваецца Упаўнаважаным і захоўваецца ў Сакратарыяце Сойма.

5. З моманту прынясення прысягі Упаўнаважаны пачынае выконваць свае абавязкі.

6. У выпадку адмовы ад прынясення прысягі асоба, абраная на пасаду Упаўнаважанага, лічыцца такой, што адмовілася ад пасады, і конкурсная камісія на працягу аднаго месяца праводзіць паўторны адбор і высоўванне новых кандыдатур на пасаду Упаўнаважанага.

**Артыкул 6. Дзейнасць, несумяшчальная з пасадай Упаўнаважанага**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека не мае права:

1.1. займацца любой аплатнай дзейнасцю, акрамя навуковай, выкладчыцкай або творчай, калі яна не перашкаджае выкананню абавязкаў Упаўнаважанага і не ўплывае на яго незалежнасць і аб’ектыўнасць;

1.2. займаць дзяржаўныя або выбарныя пасады, акрамя пасады Упаўнаважанага па правах чалавека;

1.3. быць сябрам якой-небудзь палітычнай партыі ці іншым чынам удзельнічаць у палітычнай дзейнасці, у тым ліку праводзіць агітацыю, удзельнічаць у выбарчых кампаніях ці публічна падтрымліваць кандыдатаў на дзяржаўныя пасады;

1.4. уваходзіць у склад органаў кіравання, назіральных або апякунскіх саветаў дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый, за выключэннем кансультатыўных або экспертных органаў, дзейнасць якіх непасрэдна звязаная з абаронай правоў чалавека, пры ўмове адсутнасці канфлікту інтарэсаў і права вырашальнага голасу.

2. Упаўнаважаны па правах чалавека абавязаны спыніць дзейнасць, несумяшчальную з яго пасадай, не пазней за 30 дзён з дня прызначэння на пасаду Упаўнаважанага. У выпадку невыканання гэтага патрабавання асоба лічыцца такой, што адмовілася ад пасады Упаўнаважанага.

3. Упаўнаважаны абавязаны на працягу тэрміну сваіх паўнамоцтваў выконваць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб прадухіленні і ўрэгуляванні канфлікту інтарэсаў. У выпадку ўзнікнення канфлікту інтарэсаў Упаўнаважаны абавязаны неадкладна прыняць меры па яго ўрэгуляванні ў адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Упаўнаважаны па правах чалавека абавязаны штогод падаваць дэкларацыю аб даходах і маёмасці ў парадку і ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 7. Спыненне дзейнасці, вызваленне ад пасады**

1. Дзейнасць Упаўнаважанага па правах чалавека спыняецца ў выпадку:

1.1. заканчэння тэрміну паўнамоцтваў, устаноўленага Канстытуцыяй і гэтым Законам;

1.2. смерці Упаўнаважанага.

2. Упаўнаважаны па правах чалавека можа быць вызвалены ад пасады датэрмінова ў наступных выпадках:

2.1. падачы заявы аб адстаўцы;

2.2. уступлення ў законную сілу абвінаваўчага прыгавору суда ў дачыненні да Упаўнаважанага;

2.3. спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

2.4. учыненне Упаўнаважаным дзеянняў, несумяшчальных з яго пасадай у адпаведнасці з артыкулам 6;

2.5. немагчымасці выканання абавязкаў па стане здароўя цягам больш за чатыры месяцы запар, пацверджанай медыцынскім заключэннем.

3. У выпадку спынення дзейнасці Упаўнаважанага на падставе, прадугледжанай пунктам 1.1 гэтага артыкула, Упаўнаважаны працягвае выконваць свае абавязкі да моманту прызначэння новага Упаўнаважанага.

4. У выпадку спынення дзейнасці Упаўнаважанага па падставах, прадугледжаных пунктамі 1.2, 2.2, 2.3 гэтага артыкула, паўнамоцтвы спыняюцца з моманту надыходу адпаведнай падзеі.

5. У выпадку спынення дзейнасці Упаўнаважанага па падставах, прадугледжаных пунктамі 2.1, 2.4, 2.5 гэтага артыкула, рашэнне аб спыненні паўнамоцтваў прымае Сойм па прадстаўленні спецыяльнай камісіі. Камісія абавязана на працягу 30 дзён з моманту паступлення заявы або атрымання інфармацыі аб надыходзе адной з падставаў для спынення паўнамоцтваў правесці праверку і прадставіць свае высновы і рэкамендацыі Сойма. Рашэнне аб спыненні паўнамоцтваў Упаўнаважанага прымаецца большасцю галасоў дэпутатаў Сойма, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

6. У выпадку нязгоды з рашэннем Сойма, Упаўнаважаны мае права абскардзіць гэтае рашэнне ў судзе.

7. У выпадку спынення дзейнасці Упаўнаважанага па правах чалавека яго абавязкі часова выконвае адзін з намеснікаў у адпаведнасці з службовай інструкцыяй. Пры адсутнасці намеснікаў рашэнне аб прызначэнні часова выконваючага абавязкі Упаўнаважанага з ліку супрацоўнікаў Офіса прымае Сойм. Часова выконваючы абавязкі ажыццяўляе паўнамоцтвы да прызначэння новага Упаўнаважанага, але не больш за шэсць месяцаў.

## ГЛАВА 3. ПРАВАВЫЯ ГАРАНТЫІ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ПАЎНАМОЦТВАЎ УПАЎНАВАЖАНАГА

**Артыкул 8. Незалежнасць Упаўнаважанага**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў незалежны ад якіх-небудзь дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання і службовых асоб, палітычных партый і іншых арганізацый, а таксама іх прадстаўнікоў.

2. Ніхто не мае права ўмешвацца ў дзейнасць Упаўнаважанага, аказваць уплыў на яго рашэнні, перашкаджаць рэалізацыі яго паўнамоцтваў або даваць яму абавязковыя для выканання ўказанні.

3. Упаўнаважаны самастойна вызначае прыярытэты, напрамкі працы і формы ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі і іншымі структурамі. Усе акты, заключэнні і рэкамендацыі Упаўнаважанага прымаюцца ім без якога-небудзь вонкавага ўзгаднення.

**Артыкул 9. Недатыкальнасць Упаўнаважанага**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека валодае недатыкальнасцю на працягу ўсяго тэрміну сваіх паўнамоцтваў, а таксама захоўвае імунітэт у дачыненні да дзеянняў, учыненых пры выкананні сваіх абавязкаў, пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў.

2. Упаўнаважаны, яго намеснікі і супрацоўнікі Офіса Упаўнаважанага не могуць падвяргацца пераследу або прыцягвацца да адказнасці за выказаныя меркаванні і дзеянні, выкананыя з захаваннем гэтага Закона ў сувязі з ажыццяўленнем імі сваіх службовых абавязкаў.

3. Крымінальная справа супраць Упаўнаважанага можа быць узбуджаная выключна Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь з папярэдняй згоды Сойма.

4. Упаўнаважаны не можа быць падвергнуты мерам адміністрацыйнага спагнання, якія накладаюцца ў судовым парадку, затрыманы, арыштаваны, падвергнуты вобшуку, а таксама асабістаму дагляду без згоды Сойма.

5. Недатыкальнасць Упаўнаважанага распаўсюджваецца на яго жыллё і службовае памяшканне, транспартныя сродкі, якія ім выкарыстоўваюцца, сродкі сувязі, карэспандэнцыю, дакументы і асабістую маёмасць.

6. Упаўнаважаны мае права адмовіцца ад дачы сведчых паказанняў па грамадзянскіх, адміністрацыйных або крымінальных справах аб абставінах, якія сталі яму вядомымі ў сувязі з выкананнем яго абавязкаў.

7. Права на адмову ад дачы сведчанняў у адпаведнасці з пунктам 6 гэтага артыкула распаўсюджваецца таксама на намеснікаў і іншых супрацоўнікаў Офіса Упаўнаважанага.

8. Парушэнне недатыкальнасці Упаўнаважанага, яго намеснікаў і супрацоўнікаў Офіса цягне за сабой адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 10. Абавязак супрацоўніцтва з Упаўнаважаным**

1. Дзяржаўныя органы, органы мясцовага самакіравання, юрыдычныя асобы ды іх службовыя асобы абавязаныя садзейнічаць Упаўнаважанаму па правах чалавека ў выкананні яго службовых абавязкаў.

2. Дзяржаўныя органы, органы мясцовага самакіравання, юрыдычныя асобы, службовыя асобы абавязаныя своечасова і поўна разглядаць прадстаўленні, рэкамендацыі і патрабаванні Упаўнаважанага і ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны інфармаваць яго аб прынятых мерах.

**Артыкул 11. Адказнасць за перашкоды дзейнасці Упаўнаважанага**

1. Перашкодай дзейнасці Упаўнаважанага лічацца любыя дзеянні ці бяздзеянне, якія ствараюць перашкоды для выканання яго паўнамоцтваў, у тым ліку:

1.1. адмова ў прадастаўленні або несвоечасовае прадастаўленне запытаных Упаўнаважаным звестак, дакументаў і матэрыялаў;

1.2. ухіленне ад дачы тлумачэнняў або непрадстаўленне неабходных тлумачэнняў у ходзе разгляду скарг і правядзення праверак;

1.3. абмежаванне доступу Упаўнаважанага ў дзяржаўныя органы, установы, вайсковыя часткі, месцы папярэдняга зняволення, установы выканання пакаранняў ды іншыя арганізацыі;

1.4. непрадастаўленне або несвоечасовае прадастаўленне адказаў на прадстаўленні, рэкамендацыі і патрабаванні Упаўнаважанага;

1.5. аказанне ціску на заяўнікаў, супрацоўнікаў Офіса Упаўнаважанага або асоб, якія прадстаўляюць інфармацыю Упаўнаважанаму;

1.6. перашкоджанне ажыццяўленню Упаўнаважаным маніторынгу захавання правоў і свабод чалавека;

1.7. любыя іншыя дзеянні ці бяздзеянне, якія перашкаджаюць законнай дзейнасці Упаўнаважанага.

2. Упаўнаважаны мае права апублікаваць інфармацыю аб фактах перашкоды яго дзейнасці і прынятых мерах на афіцыйных інтэрнет-рэсурсах і ў сродках масавай інфармацыі.

3. Перашкоджанне дзейнасці Упаўнаважанага па правах чалавека цягне за сабой юрыдычную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Не дапускаецца пераслед, пакаранне, запалохванне, дыскрымінацыя або іншае негатыўнае ўздзеянне на:

4.1. асоб, якія падалі скаргі Упаўнаважанаму;

4.2. супрацоўнікаў Офіса Упаўнаважанага;

4.3. сведак, экспертаў і іншых асоб, што прадаставілі інфармацыю Упаўнаважанаму або садзейнічаюць ажыццяўленню яго паўнамоцтваў.

5. Расследаванне выпадкаў перашкоды дзейнасці Упаўнаважанага, уключаючы магчымы пераслед заяўнікаў, сведак і супрацоўнікаў Офіса, ажыццяўляецца органамі пракуратуры ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6. Меры дзяржаўнай абароны асоб, указаных у гэтым артыкуле, рэалізуюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб абароне сведак і іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу.

**Артыкул 12. Узнагароджанне і сацыяльныя гарантыі Упаўнаважанага**

1. Памер аплаты працы Упаўнаважанага па правах чалавека зацвярджаецца Соймам на ўзроўні заработнай платы старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Памер аплаты працы Упаўнаважанага не можа быць зніжаны на працягу ўсяго тэрміну выканання ім сваіх паўнамоцтваў.

3. Упаўнаважанаму, вызваленаму ад пасады па падставах, не звязаных з дысцыплінарнымі парушэннямі, выплачваецца выхадная дапамога ў памеры трохразовага сярэднямесячнага заробку, і на працягу трох месяцаў прадастаўляецца праца (пасада) раўнацэнная той, якую Упаўнаважаны займаў да назначэння на пасаду Упаўнаважанага.

**Артыкул 13. Бяспека Упаўнаважанага**

Органы ўнутраных справаў і іншыя кампетэнтныя дзяржаўныя органы абавязаны прымаць неабходныя меры для забеспячэння бяспекі Упаўнаважанага па яго запыце або пры ўзнікненні пагроз жыццю, здароўю або маёмасці.

## ГЛАВА 4. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ УПАЎНАВАЖАНАГА

**Артыкул 14. Кампетэнцыі Упаўнаважанага**

Упаўнаважаны па правах чалавека:

у адпаведнасці з гэтым Законам разглядае скаргі аб парушэннях правоў і свабод чалавека;

па сваёй ініцыятыве правярае факты парушэнняў правоў і свабод чалавека;

садзейнічае шляхам кансультавання і пасярэдніцтва мірнаму ўрэгуляванню спрэчак у сферы правоў чалавека па згодзе бакоў;

садзейнічае ўдасканаленню заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі ў сферы правоў і свабод чалавека;

ажыццяўляе маніторынг выканання правоў і свабод чалавека, уключна з умовамі ўтрымання асоб, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі;

рыхтуе даклады аб сітуацыі з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;

удзельнічае ў падрыхтоўцы дакладаў, звязаных з развіццём і абаронай правоў чалавека, якія дзяржава павінна прадастаўляць у міжнародныя арганізацыі ў мэтах выканання сваіх абавязкаў;

супрацоўнічае з нацыянальнымі, замежнымі і міжнароднымі арганізацыямі, кампетэнтнымі ў пытаннях развіцця і абароны правоў чалавека.

**Артыкул 15. Бясплатнасць паслуг Упаўнаважанага**

Паслугі Упаўнаважанага зацікаўленай асобе аказваюцца бясплатна.

**Артыкул 16. Права Упаўнаважанага на доступ да інфармацыі**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права запытваць і атрымліваць ад дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, службовых асоб, арганізацый і грамадзян Рэспублікі Беларусь інфармацыю, дакументы і матэрыялы, неабходныя для рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў.

2. Упаўнаважаны мае допуск да дзяржаўных сакрэтаў і іншай ахоўнай законам тайны ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Запатрабаваныя звесткі, дакументы і матэрыялы павінны быць прадастаўленыя Упаўнаважанаму ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, але не пазней за 30 дзён з дня атрымання запыту, калі ў запыце не ўказаны іншы тэрмін.

4. Упаўнаважаны мае права атрымліваць тлумачэнні ад службовых асоб у ходзе разгляду скаргі або правядзення праверкі.

5. У выпадку адмовы ў прадастаўленні інфармацыі, Упаўнаважаны мае права звярнуцца ў суд для атрымання доступу да неабходных звестак.

6. Інфармацыя, атрыманая Упаўнаважаным, павінна выкарыстоўвацца выключна ў мэтах рэалізацыі яго паўнамоцтваў і захоўвацца ва ўмовах, якія забяспечваюць яе канфідэнцыйнасць і абарону ад несанкцыянаванага доступу.

**Артыкул 17. Права Упаўнаважанага на наведванне арганізацый**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права беспярэшкодна наведваць дзяржаўныя органы, органы мясцовага самакіравання, вайсковыя часткі, месцы пазбаўлення волі, у тым ліку турмы, следчыя ізалятары, папраўчыя ўстановы, цэнтры часовага ўтрымання ды іншыя месцы прымусовага ўтрымання, а таксама любыя іншыя арганізацыі, незалежна ад іх арганізацыйна-прававой формы.

2. Наведванні могуць ажыццяўляцца як з папярэднім паведамленнем, так і без яго, у залежнасці ад абставін і неабходнасці.

3. Кіраўнікі арганізацый, указаных у пункце 1, абавязаны садзейнічаць Упаўнаважанаму ў яго наведваннях і прадастаўляць доступ да ўсіх неабходных для праверкі памяшканняў, дакументаў і асоб.

4. У ходзе наведванняў Упаўнаважаны мае права гутарыць з любымі асобамі, якія знаходзяцца ў наведваемай арганізацыі, ва ўмовах, якія забяспечваюць канфідэнцыйнасць і свабоднае выказванне меркаванняў.

5. Упаўнаважаны мае права прыцягваць да ўдзелу ў наведваннях сваіх намеснікаў, супрацоўнікаў Офіса ды іншых спецыялістаў, якія маюць неабходныя веды і кампетэнцыі.

6. Вынікі наведванняў афармляюцца ў выглядзе акта, копія якога накіроўваецца ў адпаведную арганізацыю для прыняцця мер па ўстараненні выяўленых парушэнняў пры іх наяўнасці.

**Артыкул 18. Права Упаўнаважанага на прыём службовымі асобамі**

Упаўнаважаны па правах чалавека мае права на бесперашкодны і прыярытэтны прыём Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Прэм’ер-міністрам, Старшынёй Сойма, службовымі асобамі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый, якія абавязаны выдзяляць яму неабходны час для абмеркавання пытанняў, што тычацца правоў і свабод чалавека.

**Артыкул 19. Права Упаўнаважанага прысутнічаць на пасяджэннях калегіяльных органаў**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права прысутнічаць на пасяджэннях любых калегіяльных дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання і іншых структур, на якіх разглядаюцца пытанні, што ўваходзяць у сферу яго паўнамоцтваў.

2. Упаўнаважаны мае права выступаць на пасяджэннях калегіяльных органаў з мэтай выказвання свайго меркавання і прадстаўлення сваіх рэкамендацый.

3. Органы і ўстановы, у пасяджэннях якіх удзельнічае Упаўнаважаны, абавязаны разгледзець яго афіцыйную пазіцыю і, у выпадку прыняцця рашэння насуперак прадстаўленай пазіцыі, абгрунтаваць яго ў пісьмовай форме.

**Артыкул 20. Права Упаўнаважанага на зварот у Канстытуцыйны Суд**

1. Упаўнаважаны мае права звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд з прапановай аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, калі ён мяркуе, што гэтыя акты парушаюць правы і свабоды чалавека.

2. Упаўнаважаны мае права ўдзельнічаць у пасяджэннях Канстытуцыйнага Суда пры разглядзе справаў і пытанняў, якія датычацца правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, з правам прадстаўлення афіцыйнай думкі і рэкамендацый.

**Артыкул 21. Права Упаўнаважанага на зварот у суд**

1. Упаўнаважаны мае права звярнуцца ў суд у абарону правоў і свабод чалавека, парушаных рашэннем або дзеяннем (бяздзеяннем) дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, іншых суб'ектаў, а таксама іх службовых асоб.

2. Упаўнаважаны мае права звяртацца ў суд са скаргай на адмову выконваць накіраваныя ім рэкамендацыі, прадстаўленні або патрабаванні.

3. У выключных выпадках, калі нарматыўны прававы акт стварае непасрэдную пагрозу масаваму або грубаму парушэнню правоў чалавека,

Упаўнаважаны можа звярнуцца ў суд або іншы кампетэнтны орган з патрабаваннем аб часовым прыпыненні дзеяння такога акта да вырашэння пытання па сутнасці.

4. Упаўнаважаны мае права ўдзельнічаць у судовых працэсах асабіста ці праз сваіх прадстаўнікоў.

5. Упаўнаважаны мае права прадстаўляць у суд пісьмовыя заключэнні па справах, якія маюць важнае значэнне для абароны правоў і свабод чалавека. Суд разглядае заключэнне Упаўнаважанага як незалежнае і аўтарытэтнае меркаванне, якое адлюстроўвае праваабарончую пазіцыю.

6. Удзел Упаўнаважанага ў судовых пасяджэннях і прадстаўленне меркаванняў не павінны разглядацца як умяшанне ў ажыццяўленне правасуддзя. Упаўнаважаны не мае права ацэньваць судовыя рашэнні па сутнасці, але можа аналізаваць выкананне працэсуальных гарантый і агульнапрызнаных стандартаў справядлівага судовага разгляду.

**Артыкул 22. Права Упаўнаважанага на маніторынг судовых спраў**

1. Упаўнаважаны мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальных, грамадзянскіх спраў і спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, рашэнні па якіх уступілі ў законную сілу, калі гэтыя справы датычацца пытанняў выканання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

2. Упаўнаважаны мае права вывучаць матэрыялы спыненых вядзенняў па справах і матэрыялы, па якіх адмоўлена ва ўзбуджэнні крымінальных спраў, калі гэтыя справы датычацца пытанняў выканання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

3. Упаўнаважаны мае права прысутнічаць на пасяджэннях усіх судовых інстанцый, у тым ліку на закрытых пасяджэннях са згоды бакоў, чые справы разглядаюцца ў закрытым пасяджэнні.

**Артыкул 23. Акты рэагавання Упаўнаважанага**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права выдаваць акты рэагавання ў выпадках выяўлення парушэнняў правоў і свабод чалавека.

2. Актамі рэагавання Упаўнаважанага з'яўляюцца:

2.1. уяўленні аб устараненні выяўленых парушэнняў правоў і свабод чалавека і іх наступстваў; аб паляпшэнні ўмоў утрымання ў месцах пазбаўлення волі;

2.2. рэкамендацыі па ўдасканаленні заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі;

2.3. патрабаванні аб правядзенні службовых расследаванняў і прыцягненні вінаватых да адказнасці;

2.4. прадстаўленні аб прыцягненні да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці асоб, вінаватых у парушэнні правоў і свабод чалавека.

2.5. іншыя акты рэагавання па меркаванні Упаўнаважанага.

3. Акты рэагавання Упаўнаважанага носяць рэкамендацыйны характар і з'яўляюцца абавязковымі для разгляду дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага самакіравання, службовымі асобамі і арганізацыямі, якім яны адрасаваныя. Аб выніках разгляду, прынятых мерах або аб матываванай адмове ад іх выканання адрасаты абавязаны паведаміць Упаўнаважанага ў пісьмовай форме ў тэрмін, устаноўлены Упаўнаважаным, але не пазней за 30 каляндарных дзён.

4. У выпадку ігнаравання рэкамендацый або непрыняцця мер, Упаўнаважаны мае права ініцыяваць парламенцкія слуханні.

**Артыкул 24. Ініцыяванне парламенцкіх слуханняў**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права ініцыяваць парламенцкія слуханні ў выпадку масавых або грубых парушэнняў правоў і свабод чалавека, а таксама ў выпадку сістэматычнага ігнаравання рэкамендацый Упаўнаважанага.

2. Прапановы аб правядзенні парламенцкіх слуханняў накіроўваюцца ў Сойм з абгрунтаваннем неабходнасці іх правядзення і прадстаўленнем адпаведных фактаў і доказаў.

3. Сойм абавязаны разгледзець прапанову Упаўнаважанага аб правядзенні парламенцкіх слуханняў ва ўстаноўленыя Статутам Сойму тэрміны.

4. У выпадку адмовы ў правядзенні парламенцкіх слуханняў, Сойм абавязаны прадставіць пісьмовае абгрунтаванне свайго рашэння і прапанаваць альтэрнатыўныя меры для разгляду прадстаўленых фактаў і доказаў.

5. Упаўнаважаны мае права ўдзельнічаць у парламенцкіх слуханнях і пасяджэннях парламенцкіх камісій, прадстаўляць свае высновы і рэкамендацыі, а таксама прыцягваць да ўдзелу ў слуханнях экспертаў і сведкаў.

**Артыкул 25. Публічнасць дакументаў**

1. Усе афіцыйныя дакументы, якія выдаюцца Упаўнаважаным па правах чалавека, з'яўляюцца публічнымі і падлягаюць апублікаванню на афіцыйным інтэрнет-рэсурсе Упаўнаважанага.

2. Рашэнне аб выбары дакументаў для публікацыі, парадку і тэрмінах іх размяшчэння Упаўнаважаны прымае самастойна, за выключэннем штогадовага даклада, які падлягае абнародаванню ў поўным аб’ёме. Публікацыя можа быць абмежаваная, калі дакумент утрымлівае дзяржаўную тайну, персанальныя даныя або іншыя звесткі, што ахоўваюцца заканадаўствам, а таксама ў мэтах абароны правоў заяўнікаў і ахвяр парушэнняў або прадухілення выкарыстання гэтых дакументаў у палітычных мэтах.

**Артыкул 26. Абавязкі Упаўнаважанага**

Упаўнаважаны па правах чалавека абавязаны:

разглядаць скаргі грамадзян і арганізацый ва ўстаноўлены гэтым Законам тэрміны;

праводзіць праверкі па фактах парушэнняў правоў і свабод чалавека;

рыхтаваць і накіроўваць рэкамендацыі дзяржаўным органам, органам мясцовага самакіравання, службовым асобам і арганізацыям для ўстаранення выяўленых парушэнняў;

інфармаваць заяўнікаў аб выніках разгляду іх скарг і прынятых мерах;

рыхтаваць штогадовыя і спецыяльныя даклады аб сітуацыі з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь і прадстаўляць іх на разгляд Сойму;

захоўваць канфідэнцыйнасць інфармацыі, якая стала яму вядомай падчас выканання сваіх абавязкаў, за выключэннем выпадкаў, калі разгалашэнне інфармацыі неабходна для абароны правоў і свабод чалавека;

забяспечваць празрыстасць сваёй дзейнасці і рэгулярна інфармаваць грамадскасць аб праведзенай працы праз публікацыі на афіцыйным інтэрнэт-рэсурсе Упаўнаважанага і праз сродкі масавай інфармацыі.

**Артыкул 27. Штогадовыя і спецыяльныя даклады Упаўнаважанага**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека штогод рыхтуе даклад аб сітуацыі з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь на аснове разгледжаных скаргаў, праведзеных праверак і маніторынгу захавання правоў і свабод чалавека.

2. Змест штогадовага даклада вызначаецца Упаўнаважаным самастойна. Даклад можа, у тым ліку, утрымліваць:

2.1. аналіз стану правоў і свабод чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;

2.2. інфармацыю аб выяўленых парушэннях правоў і свабод чалавека і мерах, прынятых для іх устаранення;

2.3. рэкамендацыі па ўдасканаленні заканадаўства і практыкі яго прымянення ў сферы правоў і свабод чалавека;

2.4. інфармацыю аб прававой асвеце і іншых ініцыятывах, накіраваных на павышэнне прававой пісьменнасці грамадзян;

2.5. ацэнку эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання і службовых асоб у сферы абароны правоў чалавека;

2.6. меркаванні і рэкамендацыі міжнародных арганізацый па пытаннях захавання правоў і свабод чалавека ў Рэспубліцы Беларусь.

3. Штогадовы даклад прадстаўляецца на разгляд Сойму не пазней за 31 сакавіка года, які ідзе за справаздачным. Сойм абавязаны правесці публічнае абмеркаванне даклада, заслухацца Упаўнаважанага і прыняць рашэнне па мерах, прапанаваных у яго рэкамендацыях. Сойм не зацвярджае змест самога даклада, а разглядае прапановы, накіраваныя на ўдасканаленне праваабарончай палітыкі.

4. Упаўнаважаны мае права рыхтаваць спецыяльныя даклады па асобных пытаннях абароны правоў і свабод чалавека ў выпадку неабходнасці.

**Артыкул 28. Канфідэнцыйнасць інфармацыі**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека, яго намеснікі, супрацоўнікі Офіса і асобы, якія прыцягваюцца да работы з дакументамі і матэрыяламі Упаўнаважанага, абавязаны захоўваць канфідэнцыйнасць інфармацыі, атрыманай у ходзе ажыццяўлення іх дзейнасці.

2. Упаўнаважаны абавязаны забяспечыць абарону канфідэнцыйнай інфармацыі, у тым ліку шляхам выкарыстання тэхнічных і арганізацыйных мер, якія адпавядаюць заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Усе асобы, якія маюць доступ да канфідэнцыйнай інфармацыі, падпісваюць абавязацельствы аб невыдаванні дадзенай інфармацыі. Парушэнне абавязацельства аб неразгалошванні цягне адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Упаўнаважаны ажыццяўляе апрацоўку персанальных даных у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб абароне персанальных даных.

**Артыкул 29. Мова справаводства Упаўнаважанага**

1. Справаводства Упаўнаважанага па правах чалавека ажыццяўляецца на дзяржаўнай мове Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадку неабходнасці прадастаўлення інфармацыі на замежнай мове, Упаўнаважаны забяспечвае пераклад і засведчанне адпаведных дакументаў.

**Артыкул 30. Выкананне паўнамоцтваў у перыяд надзвычайнага або ваеннага становішча**

1. У перыяд надзвычайнага або ваеннага становішча Упаўнаважаны па правах чалавека прадаўжае выконваць свае паўнамоцтвы ў поўным аб'ёме, прадугледжаным гэтым Законам і Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

2. Абмежаванне паўнамоцтваў Упаўнаважанага ў перыяд надзвычайнага або ваеннага становішча не дапускаецца.

3. Фінансаванне дзейнасці Упаўнаважанага ў перыяд надзвычайнага або ваеннага становішча ажыццяўляецца ў прыярытэтным парадку і ў аб'ёме, неабходным для выканання яго паўнамоцтваў.

## ГЛАВА 5. НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРЭВЕНТЫЎНЫ МЕХАНІЗМ ПА ПАПЯРЭДЖАННІ КАТАВАННЯЎ

### Артыкул 31. Нацыянальны прэвентыўны механізм

1. Для выканання абавязацельстваў, што вынікаюць з Факультатыўнага пратакола да Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання, пры Офісе Упаўнаважанага па правах чалавека дзейнічае Савет па папярэджанні катаванняў (далей — Савет) у якасці нацыянальнага прэвентыўнага механізму.

2. Савет з’яўляецца аўтаномным падраздзяленнем у структуры Офіса Упаўнаважанага, якое ажыццяўляе дзейнасць у рамках паўнамоцтваў Упаўнаважанага. Савет валодае функцыянальнай, арганізацыйнай, аператыўнай і фінансавай незалежнасцю.

3. Савет не з’яўляецца следчым органам. Ён уяўляе сабой пазасудовы механізм, заснаваны на прэвентыўным падыходзе, накіраваным на абарону асоб, пазбаўленых волі, ад катаванняў і іншых формаў жорсткага абыходжання.

4. Савет дзейнічае на падставе прынцыпаў незалежнасці, бесстароннасці, аб’ектыўнасці і канфідэнцыяльнасці.

5. Палажэнне аб арганізацыі і функцыянаванні Савета зацвярджаецца Упаўнаважаным. Яно не падлягае ўзгадненню з іншымі дзяржаўнымі органамі.

### Артыкул 32. Склад Савета па папярэджанні катаванняў

1. Савет складаецца з сямі сябраў, уключаючы старшыню — Упаўнаважанага па правах чалавека, які ўваходзіць у Савет па пасадзе.

2. Астатнія сябры Савета адбіраюцца па выніках адкрытага, празрыстага і недыскрымінацыйнага конкурсу, арганізаванага Офісам Упаўнаважанага. У конкурснай працэдуры павінны ўдзельнічаць прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, навуковай і прафесійнай супольнасці.

3. Савет фарміруецца з улікам гендарнага балансу, прафесійнай разнастайнасці і адсутнасці канфлікту інтарэсаў з ліку асоб, якія валодаюць ведамі і досведам у галіне правоў чалавека, медыцыны, псіхалогіі, сацыяльнай работы, пенітэнцыярнай і прававой сферы.

4. Не могуць быць сябрамі Савета:

4.1. асобы, што займаюць дзяржаўныя і выбарныя пасады;

4.2. члены палітычных партый;

4.3. супрацоўнікі праваахоўных органаў;

4.4. асобы, якія знаходзяцца ў канфлікце інтарэсаў.

5. Сябры Савета надзяляюцца службовымі пасведчаннямі і карыстаюцца гарантыямі недатыкальнасці, прадугледжанымі артыкулам 9 гэтага Закона для супрацоўнікаў Офіса Упаўнаважанага.

**Артыкул 33. Паўнамоцтвы Савета і забеспячэнне дзейнасці**

1. У рамках выканання функцый нацыянальнага прэвентыўнага механізму Савет:

1.1. ажыццяўляе рэгулярныя і раптоўныя наведванні месцаў прымусовага ўтрымання, указаных у артыкуле 17 гэтага Закона, без папярэдняга паведамлення аб часе і мэце;

1.2. ацэньвае ўмовы ўтрымання, абыходжанне з асобамі, што знаходзяцца ў ізаляцыі, і выкананне іх правоў;

1.3. распрацоўвае рэкамендацыі і прапановы па папярэджанні катаванняў і паляпшэнні ўмоў утрымання;

1.4. уносіць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі;

1.5. удзельнічае ў падрыхтоўцы спецыяльных дакладаў, уключаючы штогадовы даклад аб стане недапушчэння катаванняў, які прадстаўляецца Сойму і падлягае абавязковаму абнародаванню;

1.6. узаемадзейнічае з Падкамітэтам ААН па папярэджанні катаванняў, іншымі міжнароднымі структурамі і праваабарончымі механізмамі;

1.7. прыцягвае прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, навуковай і экспертнай супольнасці, уключаючы замежных экспертаў, да правядзення маніторынгавых візітаў і іншых мерапрыемстваў;

1.8. ажыццяўляе іншыя дзеянні, прадугледжаныя мандатам нацыянальнага прэвентыўнага механізму ў адпаведнасці з Факультатыўным пратаколам да Канвенцыі супраць катаванняў.

2. Сябры Савета маюць права:

2.1. на бесперашкодны доступ ва ўсе памяшканні і ўстановы, указаныя ў артыкуле 17 гэтага Закона;

2.2. на канфідэнцыйныя зносіны з асобамі, што знаходзяцца ў ізаляцыі, без прысутнасці старонніх асоб;

2.3. на запыт і атрыманне дакументаў, тлумачэнняў і інфармацыі, неабходных для выканання сваіх функцый.

3. Сродкі, неабходныя для ажыццяўлення паўнамоцтваў Савета, прапісваюцца асобным радком у складзе бюджэту Офіса Упаўнаважанага па правах чалавека.

## ГЛАВА 6. ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ СКАРГАЎ

**Артыкул 34. Права на падачу скаргі Упаўнаважанаму**

1. Любая фізічная асоба, правы і свабоды якой былі парушаны, а таксама юрыдычная асоба ў інтарэсах фізічнай асобы, мае права звярнуцца са скаргай да Упаўнаважанага па правах чалавека.

2. Скарга можа быць пададзена прадстаўніком асобы, чые правы былі парушаны, на падставе даверанасці або іншага дакумента, які пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка.

3. Грамадскія аб'яднанні, праваабарончыя арганізацыі ды іншыя асобы, якія маюць законную цікавасць у абароне правоў і свабод іншых асоб, маюць права падаваць скаргі ў інтарэсах асоб, чые правы і свабоды былі парушаны.

4. Скарга павінна быць пададзена на працягу аднаго года з моманту, калі заяўніку стала вядома або павінна было стаць вядома аб парушэнні правоў і свабод, калі Упаўнаважаны не знойдзе важкіх прычын для пропуску гэтага тэрміна.

5. У выпадку скаргаў на сістэматычныя або масавыя парушэнні правоў і свабод чалавека, Упаўнаважаны можа прыняць іх да разгляду незалежна ад заканчэння тэрміну даўніны, калі палічыць гэта неабходным для абароны грамадскіх інтарэсаў.

6. У асаблівых выпадках, звязаных з грубымі парушэннямі правоў чалавека, Упаўнаважаны мае права прыняць скаргу да разгляду пасля заканчэння ўстаноўленага тэрміну, калі палічыць гэта неабходным для аднаўлення справядлівасці.

7. Упаўнаважаны па правах чалавека разглядае скаргі на парушэнні правоў і свабод чалавека, незалежна ад таго, пададзеныя яны непасрэдна пацярпелымі асобамі або іх прадстаўнікамі.

**Артыкул 35. Скаргі, якія не падлягаюць разгляду Упаўнаважаным**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека не разглядае скаргі:

1.1. ананімныя, за выключэннем выпадкаў, якія, на думку Упаўнаважанага, патрабуюць неадкладнага ўмяшання;

1.2. якія змяшчаюць нецэнзурныя выразы, пагрозы і абразы, за выключэннем выпадкаў, калі са зместу скаргі відавочна вынікае парушэнне правоў і свабод чалавека, якое патрабуе неадкладнага ўмяшання;

1.3. паўторныя, па якіх Упаўнаважаным было прынята канчатковае рашэнне, за выключэннем выпадкаў, калі заяўнік дае новыя факты або доказы, якія маюць значэнне для справы;

1.4. якія датычацца пытанняў, вырашэнне якіх не ўваходзіць у кампетэнцыю Упаўнаважанага.

2. Упаўнаважаны не разглядае скаргі, якія датычацца:

2.1. спрэчак, якія знаходзяцца ў судовай вытворчасці, за выключэннем выпадкаў, калі разглядаюцца пытанні захавання правоў і свабод чалавека падчас судовага разбору;

2.2. рашэнняў, вынесеных судамі, за выключэннем выпадкаў, калі гэтыя скаргі датычацца парушэнняў працэсуальных правоў удзельнікаў судовага разбору або выканання судовых рашэнняў.

3. Аб адмове ў разглядзе скаргі, Упаўнаважаны абавязаны паведаміць заяўніку ў пісьмовай форме з указаннем прычын адмовы і, пры магчымасці, растлумачыць парадак звароту ў кампетэнтныя органы.

4. Упаўнаважаны мае права перанакіраваць скаргу, якая не падлягае яго разгляду, у кампетэнтны орган, паведаміўшы пра гэта заяўніку.

**Артыкул 36. Падача скаргі Упаўнаважанаму**

1. Скарга можа быць пададзена:

1.1. у пісьмовай форме шляхам адпраўкі па пошце па адрасе Офіса Упаўнаважанага або дастаўлена асабіста заяўнікам або яго прадстаўніком у Офіс. Пісьмовая скарга павінна быць падпісана заяўнікам ці яго прадстаўніком;

1.2. у электроннай форме праз афіцыйны інтэрнет-рэсурс Упаўнаважанага або адпраўлена на афіцыйную электронную пошту Упаўнаважанага. Электронная скарга павінна змяшчаць электронны подпіс заяўніка, калі такая магчымасць прадугледжана заканадаўствам;

1.3. вусна пры асабістым звароце заяўніка ў Офіс Упаўнаважанага. Пры падачы вуснай скаргі супрацоўнік Офіса складае пратакол, у якім фіксуецца сутнасць скаргі, асабістыя даныя заяўніка і яго подпіс;

1.4. з выкарыстаннем іншых сродкаў сувязі, у тым ліку тэлефона, калі такая магчымасць прадугледжана ўнутранымі рэгламентамі Офіса Упаўнаважанага. У выпадку падачы скаргі па тэлефоне, супрацоўнік Офіса складае пратакол тэлефоннай размовы.

2. Скарга павінна змяшчаць:

2.1. прозвішча, імя, імя па бацьку для фізічнай асобы і найменне для юрыдычнай асобы заяўніка;

2.2. кантактную інфармацыю заяўніка (тэлефон, электронная пошта, месца жыхарства ці знаходжання);

2.3. апісанне сутнасці парушанага права або свабоды;

2.4. абставіны, пры якіх адбылося парушэнне, з указаннем часу і месца;

2.5. доказы, якія пацвярджаюць факт парушэння (калі ёсць);

2.6. патрабаванні заяўніка.

3. Да скаргі могуць прыкладацца дакументы і матэрыялы, якія пацвярджаюць выкладзеныя ў ёй абставіны, а таксама любая іншая інфармацыя, якая можа садзейнічаць усебаковаму і аб'ектыўнаму разгляду скаргі.

4. Скарга складаецца на дзяржаўнай мове Рэспублікі Беларусь. У выпадку неабходнасці падачы скаргі на замежнай мове, заяўнік абавязаны забяспечыць яе пераклад на дзяржаўную мову.

5. Скарга рэгіструецца ў дзень яе паступлення ў Офіс Упаўнаважанага і заяўніку выдаецца пацвярджэнне аб прыёме скаргі з указаннем даты і рэгістрацыйнага нумара.

6. Упаўнаважаны правярае адпаведнасць скаргі ўстаноўленым гэтым Законам патрабаванням і на працягу 10 рабочых дзён прымае адно з наступных рашэнняў:

6.1. прыняць скаргу да разгляду;

6.2. адмовіць у прыняцці скаргі да разгляду з указаннем прычын адмовы.

7. Заяўнік паведамляецца аб прынятым рашэнні на працягу 3 працоўных дзён з моманту яго прыняцця.

8. Заяўнік мае права адклікаць пададзеную скаргу ў любы момант да прыняцця Упаўнаважаным рашэння па ёй. Водгук скаргі ажыццяўляецца ў пісьмовай або электроннай форме з указаннем рэгістрацыйнага нумара скаргі.

**Артыкул 37. Падача скаргі асобай, якая знаходзіцца ў месцах прымусовага ўтрымання.**

1. Адміністрацыя месцаў прымусовага ўтрымання абавязана інфармаваць асоб, якія знаходзяцца ў гэтых месцах, аб іх праве на падачу скаргі Упаўнаважанаму па правах чалавека і аб парадку падачы такіх скарг. Інфармацыя аб парадку падачы скаргаў павінна быць размешчана на бачным месцы і даступна для ўсіх асоб, якія знаходзяцца ў месцах прымусовага ўтрымання.

2. Асобы, якія знаходзяцца ў месцах прымусовага ўтрымання, могуць падаць скаргу непасрэдна Упаўнаважанаму пры асабістай сустрэчы ў час яго наведвання месца прымусовага ўтрымання або ў пісьмовай форме праз адміністрацыю месца прымусовага ўтрымання.

3. Адміністрацыя месцаў прымусовага ўтрымання абавязана забяспечыць магчымасць падачы скаргі без папярэдняга азнаямлення з яе зместам і цэнзуры, у запячатаным канверце, які не падлягае ўскрыццю.

4. Адміністрацыя месца прымусовага ўтрымання абавязана на працягу 24 гадзін з моманту атрымання скаргі накіраваць яе Упаўнаважанаму.

5. Скаргі асоб, якія знаходзяцца ў месцах прымусовага ўтрымання, накіроўваюцца Упаўнаважанаму бясплатна.

6. У выпадку падачы скаргі асобай, якая знаходзіцца ў месцах прымусовага ўтрымання, на замежнай мове, яе пераклад на дзяржаўную мову забяспечвае Офіс Упаўнаважанага.

**Артыкул 38. Разгляд скаргаў Упаўнаважаным**

1. Скаргі разглядаюцца ў парадку чарговасці іх паступлення, за выключэннем выпадкаў, якія патрабуюць неадкладнага ўмяшання.

2. Па выніках разгляду скаргі Упаўнаважаны па правах чалавека можа прыняць адно з наступных рашэнняў:

2.1. прызнаць скаргу абгрунтаванай;

2.2. прызнаць скаргу часткова абгрунтаванай;

2.3. прызнаць скаргу неабгрунтаванай.

3. У выпадку прызнання скаргі абгрунтаванай або часткова абгрунтаванай, Упаўнаважаны прымае меры па ўстараненні выяўленых парушэнняў, уключаючы:

3.1. накіраванне рэкамендацый або прадстаўленняў у адпаведныя дзяржаўныя органы, органы мясцовага самакіравання, службовым асобам або арганізацыям для прыняцця мер па ўстараненні парушэнняў;

3.2. забеспячэнне кантролю за выкананнем рэкамендацый і прадстаўленняў;

3.3. прадастаўленне заяўніку дапамогі ў аднаўленні яго правоў у частцы прызнаных парушэнняў.

4. У выпадку прызнання скаргі неабгрунтаванай, Упаўнаважаны выносіць матываванае рашэнне з указаннем прычын адмовы ў задавальненні скаргі.

5. Упаўнаважаны абавязаны паведаміць заяўніку і зацікаўленым дзяржаўным органам, службовым асобам або арганізацыі аб прынятым рашэнні ў тэрмін не пазней за 5 працоўных дзён з дня яго афармлення.

**Артыкул 39. Гарантыі абароны правоў чалавека пры разглядзе скаргаў Упаўнаважаным**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека забяспечвае канфідэнцыйнасць інфармацыі, атрыманай падчас разгляду скарг, і выкарыстоўвае яе выключна для мэт абароны правоў і свабод чалавека.

2. Забараняецца пераслед або дыскрымінацыя заяўніка з боку дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, службовых асоб, арганізацый або іншых асоб у сувязі з падачай скаргі. Упаўнаважаны прымае меры для абароны заяўнікаў ад любых форм праследу, уключна са зваротам у кампетэнтныя органы для прыцягнення вінаватых асоб да адказнасці.

3. Упаўнаважаны аказвае садзейнічанне заяўнікам у абароне іх правоў і свабод, уключна з прадстаўленнем іх інтарэсаў у дзяржаўных органах. Заяўнікі маюць права на атрыманне інфармацыі аб ходзе і выніках разгляду іх скаргаў.

4. Упаўнаважаны разглядае скаргі на аснове прынцыпаў справядлівасці і аб'ектыўнасці, прымаючы да ўвагі ўсе абставіны справы і забяспечваючы роўныя магчымасці для ўсіх бакоў прадстаўляць свае пазіцыі і доказы. Усе рашэнні Упаўнаважанага павінны быць абгрунтаванымі і матываванымі, заснаванымі на законе і фактычных даных.

5. Заяўнікі маюць права абскардзіць дзеянні, рашэнні ці бяздзеянне Упаўнаважанага ў судовым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6. Заяўнікі ды іншыя зацікаўленыя асобы маюць права ўдзельнічаць у разглядзе скаргі, прадастаўляць тлумачэнні, прадстаўляць доказы і аргументы, заяўляць хадайніцтвы.

7. Упаўнаважаны інфармуе заяўнікаў або іх прадстаўнікоў аб этапах працэсу разгляду іх скаргаў.

**Артыкул 40. Садзейнічанне мірнаму ўрэгуляванню спрэчак**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека з мэтай садзейнічання абароне правоў і свабод чалавека можа ўдзельнічаць у мірным урэгуляванні спрэчак паміж грамадзянамі і дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага самакіравання, іх службовымі асобамі, дзяржаўнымі і іншымі арганізацыямі, калі такія спрэчкі закранаюць пытанні парушэння правоў і свабод чалавека.

2. Упаўнаважаны мае права па звароце бакоў або па ўласнай ініцыятыве:

2.1. ініцыяваць працэдуру ўрэгулявання канфлікту ў форме кансультавання, прымірэння або пасярэдніцтва;

2.2. праводзіць канфідэнцыяльныя сустрэчы і перамовы з удзелам бакоў;

2.3. садзейнічаць выпрацоўцы ўзаемапрымальнага рашэння;

2.4. пры згодзе бакоў рыхтаваць рэкамендацыі, мемарандумы або пагадненні.

3. Працэдура прымірэння ажыццяўляецца добраахвотна, пры наяўнасці згоды абедзвюх бакоў.

4. Удзел у працэдуры не пазбаўляе бакі права надалей выкарыстоўваць іншыя сродкі абароны правоў, у тым ліку судовыя, калі згода па сутнасці не дасягнута.

5. Інфармацыя, атрыманая Упаўнаважаным у ходзе ўрэгулявання спрэчкі, не падлягае разгалошванню без згоды бакоў, за выключэннем выпадкаў, прама прадугледжаных заканадаўствам.

# ГЛАВА 7. АБАРОНА І ПРАСОЎВАННЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Артыкул 41. Расследаванне па ўласнай ініцыятыве**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права ініцыяваць расследаванне па ўласнай ініцыятыве, калі ён бачыць дастатковыя падставы.

2. Вынікі расследавання афармляюцца ў выглядзе акта, які накіроўваецца адпаведным дзяржаўным органам, органам мясцовага самакіравання, службовым асобам або арганізацыям для прыняцця мер па ўстараненні выяўленых парушэнняў.

**Артыкул 42. Правядзенне інспекцый**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека мае права праводзіць інспекцыі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага самакіравання, арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў, уключаючы турмы, следчыя ізалятары, папраўчыя ўстановы, цэнтры часовага ўтрымання ды іншыя месцы прымусовага ўтрымання (далей - аб'екты інспекцыі) для праверкі захавання правоў і свабод чалавека.

2. Аб'екты інспекцыі абавязаны садзейнічаць Упаўнаважанаму і прадастаўляць доступ да неабходнай інфармацыі і памяшканняў.

**Артыкул 43. Дзейнасць Упаўнаважанага па ўдасканаленні заканадаўства аб правах чалавека**

Упаўнаважаны па правах чалавека садзейнічае ўдасканаленню заканадаўства аб правах чалавека шляхам:

правядзення аналізу дзейнага заканадаўства і практыкі яго прымянення ў сферы правоў і свабод чалавека;

падрыхтоўкі прапановаў і рэкамендацый па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, накіраваных на паляпшэнне абароны правоў і свабод чалавека;

удзелу ў распрацоўцы і экспертызе праектаў нарматыўных прававых актаў, якія датычацца правоў і свабод чалавека;

ажыццяўлення маніторынгу і аналізу міжнароднага досведу і практык у сферы абароны правоў чалавека з мэтай іх адаптацыі і ўкаранення ў нацыянальнае заканадаўства.

**Артыкул 44. Дзейнасць Упаўнаважанага па прававой асвеце**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека садзейнічае прававой асвеце грамадзян з мэтай павышэння дасведчанасці аб правах і свабодах чалавека, а таксама аб механізмах іх абароны.

2. Упаўнаважаны ажыццяўляе распрацоўку і распаўсюджванне інфармацыйна-адукацыйных матэрыялаў, арганізацыю і правядзенне асветніцкіх мерапрыемстваў, інфармацыйных кампаній.

3. Упаўнаважаны можа ініцыяваць правядзенне даследаванняў, апытанняў ды іншых аналітычных мерапрыемстваў для ацэнкі ўзроўню прававой пісьменнасці грамадзян і эфектыўнасці мер па прававой асвеце.

4. Упаўнаважаны супрацоўнічае з установамі адукацыі, аказваючы метадычную дапамогу ў распрацоўцы і ўкараненні курсаў і праграм па правах чалавека.

5. Упаўнаважаны садзейнічае развіццю прававой культуры ў грамадстве, падтрымліваючы ініцыятывы, накіраваныя на ўмацаванне павагі да правоў і свабод чалавека, законнасці і правапарадку, узаемадзейнічае з праваабарончымі арганізацыямі.

**Артыкул 45. Дзейнасць Упаўнаважанага па развіцці міжнароднага супрацоўніцтва**

1. Упаўнаважаны па правах чалавека садзейнічае развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы абароны правоў і свабод чалавека, прымаючы ўдзел у міжнародных і рэгіянальных праваабарончых ініцыятывах і праектах, форумах, канферэнцыях, семінарах і іншых мерапрыемствах, прысвечаных пытанням правоў чалавека.

2. У сферы міжнароднага супрацоўніцтва Упаўнаважаны мае права:

2.1. заключаць пагадненні аб супрацоўніцтве з міжнароднымі і рэгіянальнымі арганізацыямі па пытаннях абароны правоў і свабод чалавека;

2.2. ініцыяваць, удзельнічаць і рэалізоўваць міжнародныя праекты і праграмы, накіраваныя на абарону і прасоўванне правоў і свабод чалавека ў Рэспубліцы Беларусь;

2.3. накіроўваць свае заключэнні, рэкамендацыі і даклады міжнародным арганізацыям, кампетэнтным у сферы правоў чалавека, а таксама ўдзельнічаць у разглядзе гэтых пытанняў на міжнародным узроўні;

3. Упаўнаважаны інфармуе міжнародныя арганізацыі і партнёраў аб сітуацыі з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, прадстаўляючы аб'ектыўныя даныя і факты, а таксама меры, якія прымаюцца для паляпшэння сітуацыі.

4. Упаўнаважаны мае права прадстаўляць інтарэсы заяўнікаў у міжнародных судовых і іншых органах, якія разглядаюць скаргі на парушэнні правоў і свабод чалавека. Мае права накіроўваць запыты і атрымліваць інфармацыю аб стане разгляду спраў у міжнародных судовых і іншых органах, якія датычацца правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь.

5. Упаўнаважаны арганізуе абмен візітамі і стажыроўкамі з амбудсмэнамі і праваабарончымі ўстановамі іншых краін для павышэння кваліфікацыі і абмену досведам.

## ГЛАВА 8. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ УПАЎНАВАЖАНАГА І ЯГО ОФІСА

**Артыкул 46. Офіс Упаўнаважанага па правах чалавека**

1. Офіс Упаўнаважанага па правах чалавека ствараецца ў якасці нацыянальнай установы па садзейнічанні і абароне правоў чалавека ў адпаведнасці з Парыжскімі прынцыпамі, прынятымі рэзалюцыяй 48/134 Генеральнай Асамблеі ААН ад 20 снежня 1993 года.

2. Офіс з'яўляецца дзяржаўнай установай з правам юрыдычнай асобы, мае разліковы і іншыя рахункі, пячатку і бланкі са сваім найменнем і з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

3. Офіс валодае арганізацыйнай, функцыянальнай і фінансавай незалежнасцю ад любых дзяржаўных органаў, юрыдычных і фізічных асоб.

4. Офіс Упаўнаважанага ажыццяўляе юрыдычнае, арганізацыйнае, навукова-аналітычнае, інфармацыйна-даведачнае і іншае забеспячэнне дзейнасці Упаўнаважанага.

5. Палажэнне аб арганізацыі і функцыянаванні Офіса зацвярджаецца Соймам. Унутраны распарадак, штатны расклад, структура Офіса, а таксама ўнутраныя рэгламенты дзейнасці падраздзяленняў зацвярджаюцца Упаўнаважаным.

6. Арганізацыйная структура, штатная колькасць і парадак дзейнасці Офіса зацвярджаецца Упаўнаважаным у межах сродкаў, прадугледжаных бюджэтам Офіса.

7. Агульнае кіраўніцтва Офісам ажыццяўляецца Упаўнаважаным. Арганізацыйнай і адміністрацыйнай дзейнасцю Офіса кіруе Намеснік Упаўнаважанага. Па рашэнні Упаўнаважанага ў структуры Офіса можа быць уведзена пасада дырэктара, які ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва адміністрацыйнай, кадравай і фінансавай дзейнасцю Офіса. Паўнамоцтвы дырэктара вызначаюцца Упаўнаважаным.

**Артыкул 47. Персанал Офіса**

1. Персанал Офіса ўключае самога Упаўнаважанага, яго намесніка (намеснікаў), прадстаўнікоў, іншых працаўнікоў і спецыялістаў, а таксама тэхнічны персанал.

2. Упаўнаважаны можа мець аднаго ці некалькіх намеснікаў. Намеснік (намеснікі) Упаўнаважанага назначаюцца і вызваляюцца ад пасады Соймам па прадстаўленні Упаўнаважанага. Упаўнаважаны самастойна вызначае вобласці і напрамкі дзейнасці намесніка (намеснікаў).

3. Упаўнаважаны мае права прызначаць у межах выдзеленых бюджэтных сродкаў сваіх прадстаўнікоў, якія дзейнічаюць ад яго імя і ў яго інтарэсах для выканання пэўных задач. Прадстаўнікі могуць быць прызначаныя на пастаяннай ці часовай аснове.

4. Прадстаўнікі могуць ажыццяўляць дзейнасць:

4.1. па тэрытарыяльным прынцыпе (тэрытарыяльныя прадстаўнікі);

4.2. па напрамках абароны асобных правоў чалавека (тэматычныя прадстаўнікі).

5. Аб’ём паўнамоцтваў прадстаўнікоў, парадак іх узаемадзеяння з Офісам і ўмовы дзейнасці вызначаюцца Упаўнаважаным.

6. Упаўнаважаны прызначае на пасаду і вызваляе ад пасады працаўнікоў Офіса.

7. Памер аплаты працы намеснікаў Упаўнаважанага ўстанаўліваецца на ўзроўні заработнай платы суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Должнасныя аклады супрацоўнікаў Офіса вызначаюцца з улікам важнасці выконваемых задач, кваліфікацыі, узроўню адказнасці, аб’ёму паўнамоцтваў і не могуць быць ніжэйшымі за ўзроўні, устаноўленыя для дзяржаўных служачых адпаведнай катэгорыі. Офіс мае права ўжываць асобныя ўмовы найму, якія адрозніваюцца ад звычайных правілаў дзяржаўнай службы, калі гэта неабходна для прыцягнення высокакваліфікаваных спецыялістаў.

8. Намеснікі, прадстаўнікі, супрацоўнікі Офіса надзяляюцца прадугледжанымі гэтым Законам паўнамоцтвамі і выконваюць функцыянальныя абавязкі згодна са службовымі інструкцыямі, якія зацвярджаюцца Упаўнаважаным.

9. Упаўнаважаны можа дэлегаваць свае паўнамоцтвы намеснікам, прадстаўнікам і супрацоўнікам Офіса, за выключэннем права на зварот у Канстытуцыйны Суд.

10. Упаўнаважаны па правах чалавека і яго намеснік /намеснікі/ маюць пасведчанні, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы і статус. Парадак афармлення, выдачы і замены пасведчанняў Упаўнаважанага і яго намеснікаў устанаўліваецца Соймам.

Персанал Офіса мае службовыя пасведчанні, узор якіх, а таксама парадак выдачы, выкарыстання і водгуку зацвярджаюцца Упаўнаважаным.

**Артыкул 48. Кансультатыўныя ды экспертныя парады**

1. Пры Офісе Упаўнаважанага могуць ствараца кансультатыўныя і экспертныя саветы для прадастаўлення прафесійнай і навуковай падтрымкі, садзейнічання рэалізацыі мандата Упаўнаважанага, у тым ліку для ўдзелу ў маніторынгу, аналізе, падрыхтоўцы дакладаў, асветніцкай дзейнасці, распрацоўцы рэкамендацый, абмеркаванні прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Офіса.

2. Фарміраванне саветаў ажыццяўляецца з улікам прынцыпаў незалежнасці, прафесійнай разнастайнасці, гендарнага балансу і адсутнасці канфлікту інтарэсаў. У склад саветаў уключаюцца прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, навуковай і экспертнай супольнасці, прафесійных саюзаў, праваабарончых і міжнародных арганізацый у залежнасці ад мэтаў і задач канкрэтнага савета. Пры неабходнасці можа праводзіцца перыядычная ратацыя сябраў саветаў.

3. Палажэнні аб дзейнасці, складзе і працэдурах фарміравання саветаў зацвярджаюцца Упаўнаважаным. Арганізацыю працы саветаў забяспечвае Офіс Упаўнаважанага.

**Артыкул 49. Фінансаванне дзейнасці Упаўнаважанага і яго Офіса**

1. Дзейнасць Упаўнаважанага па правах чалавека і яго Офіса фінансуецца з дзяржаўнага бюджэту на падставе прадстаўлення Упаўнаважанага. Асігнаванні прапісваюцца асобным радком у дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь.

2. Фінансаванне дзейнасці Офіса павінна быць дастатковым для выканання ўсіх яго функцый у адпаведнасці з Парыжскімі прынцыпамі, уключаючы забеспячэнне рэгіянальнай прысутнасці, незалежных экспертыз і ўдзелу ў міжнародных механізмах па правах чалавека.

3. Адвольнае скарачэнне фінансавання, што выдзяляецца з дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь, не дапускаецца. Любыя скарачэнні гэтай часткі патрабуюць афіцыйнага абгрунтавання і папярэдняга зацвярджэння Соймам.

4. Урад не мае права звяртацца ў Сойм з прапановай аб карэкціроўцы бюджэту Упаўнаважанага без узгаднення з Упаўнаважаным.

5. Офіс можа атрымліваць дадатковыя сродкі з іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, уключна з замежнай бязвыплатнай і міжнароднай тэхнічнай дапамогай, прыватныя ахвяраванні, калі такія крыніцы не ўплываюць на незалежнасць Упаўнаважанага.

6. Упаўнаважаны самастойна распрацоўвае і зацвярджае каштарыс выдаткаў на забеспячэнне сваёй дзейнасці і дзейнасці Офіса ў межах выдзеленых і прыцягнутых сродкаў.

7. Упаўнаважаны штогод складае справаздачу аб фінансавай дзейнасці, якая ўключае інфармацыю аб расходаванні бюджэтных сродкаў, якая падлягае апублікаванню.

## ГЛАВА 9. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 50. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон ўступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Артыкул 51. Прывядзенне нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам**

1. Ураду Рэспублікі Беларусь на працягу шасці месяцаў з дня ўступлення ў сілу гэтага Закона:

1.1. забяспечыць прывядзенне нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

1.2. прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

2. Міністэрствам ды іншым дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь на працягу шасці месяцаў з дня ўступлення ў сілу гэтага Закона прывесці свае нарматыўныя прававыя акты ў адпаведнасць з гэтым Законам.

**Артыкул 52. Пераходныя палажэнні**

1. Назначэнне першага Упаўнаважанага па правах чалавека ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым Законам, не пазней як праз тры месяцы з дня ўступлення яго ў сілу.

2. Упаўнаважаны на працягу трох месяцаў з дня свайго прызначэння распрацоўвае і зацвярджае структуру і штатны расклад Офіса Упаўнаважанага.

3. Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь прымяняюцца ў частцы, якая не супярэчыць гэтаму Закону.